# Анатоль Вярцінскі
# «Рэквіем па кожным чацвёртым»

Урок беларускай літаратуры ў 7 класе

**В. В. Адамовіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
другой катэгорыі
СШ № 5 г. Мазыра

**Тэма ўрока:** А.Вярцінскі. “Рэквіем па кожным чацвёртым”.

**Мэта:** садзейнічаць асэнсаванню падзей Вялікай Айчыннай вайны на аснове аналізу вершаванага твора, пабудове міралюбівага і адкрытага грамадства ў інтарэсах устойлівага развіцця, забеспячэнне доступу да правасуддзя для ўсіх (МУР № 16).

**Задачы:** дапамагчы вучням асэнсаваць драматычны змест твора, абудзіць у іх пачуццё болю за страты, нанесеныя беларускаму народу ў час вайны; развіваць навыкі творчага мыслення, цікавасць да пабудовы міралюбівага і адкрытага грамадства; садзейнічаць выхаванню пачуцця адказнасці за зробленае, павагі да свайго народа, гонару за яго мужнасць і гераізм.

**Тып урока:** засваення новых ведаў.

**Віды кампетэнцый:** урок садзейнічае развіццю вучэбна-пазнавальнай, камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Абсталяванне:** партрэт А. Вярцінскага**,** верш А. Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвёртым”, фрагмент вакальна-сімфанічнай паэмы беларускага кампазітара Генрыха Вагнера “Вечна жывыя”, малюнкі дзяцей сучаснай Беларусі, відэа “Великая Отечественная война и Я”.

**Эпіграф:**

1. Я вас прашу, не зведаў хто вайны,
Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй –
Каб потым ёй не зарасці травой.

*А. Вярцінскі*

2.У сэрцы чалавека закладзена сіла, якая дапамагае атрымаць жаданае. Яна не дасць

спакою, пакуль ты не дойдзеш да таго самага пункта, да якога імкнуўся. Усё магчыма пры адной умове: па сапраўднаму хацець таго, да чаго ідзеш.

*І. Захарчук*

**Ход урока**

**1. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на ўрок**

- Вітаю вас, мае паважаныя сямікласнікі. Сёння я хачу, каб вы падумалі, гледзячы на фотаздымак:

*(Дадатак 1)*

- Якія думкі ў вас узнікаюць, што нагадвае выява?
- Падбярыце назву выяве? На якія думкі наводзіць назва?
- Сумныя думкі ў вас узнікаюць, і размова ў нас будзе не вельмі вясёлая, нават трагічная.

2. **Паведамленне тэмы ўрока**

- Мы пазнаёмімся з творам Анатоля Вярцінскага “Рэквіем па кожным чацвёртым”, які напісаны ў новым для вас жанры **рэквіема**.
- Звяртаю вашу ўвагу, што дамашняе заданне будзе праверана ў час хвілінкі-адпачынку. **Дамашняе заданне:** паведамленне “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям’і”.

**3. Мэтавызначэнне**

- Дзеці, як вы разумееце паняцце “гістарычная памяць”? *(Адказы вучняў)*

- Гістарычная памяць – паняцце калектыўнае. Яна складзена ў захаванні грамадскага, а таксама разуменні гістарычнага вопыту. Калектыўная памяць пакаленняў можа быць як сярод членаў сям'і, насельніцтва горада, так і ва ўсёй нацыі, краіны і ўсяго чалавецтва.

- 22 чэрвеня 1941 года і 9 мая 1945 года. З чым у вас асацыіруюцца гэтыя даты? *(Дзеці, канешне, адкажуць: вайна, боль, гора, слёзы, стрэлы, выбухі…)*

- Так, дзеці, гэта Вялікая Айчынная вайна, якая спыніла жыццё кожнага чацвёртага беларуса.

Літаратура не можа існаваць без гісторыі. Пісьменнікі, як і мы, жывуць у свой час, аднак звяртаюцца да гераічных і трагічных падзей мінулага. Ці можам мы лічыць Вялікую Айчынную вайну далёкай гісторыяй? *(Адказы вучняў)*

- Як вы мяркуеце, пра што мы будзем гаварыць на сённяшнім уроку?

*(Пра цану Перамогі, трагедыю нашага народа.)*

- Толькі памятаючы, што на свеце ёсць гора, мы навучымся цаніць

тое, што ў нас ёсць: бацькоўскі дом, мірнае неба над галавой, шчэбет птушак у лясах.Такім чынам, сённяшні ўрок яшчэ раз зверне нас да нашай гістарычнай памяці, яшчэ раз пакажа нам: каб стварыць будучае, трэба не забываць мінулае, трэба памятаць тых, кім заваявана наша Перамога. І дамапожа нам у гэтым верш А.Вярцінскага. Звернемся да эпіграфа нашага ўрока, тэмы і сфармулюем задачы ўрока. *(Адзін вучань чытае эпіграф)*

*Буду ведаць…*

*Буду ўмець…*

**4. Знаёмства з новай тэмай**

**4.1. Уступнае слова настаўніка**

- Паэт Анатоль Вярцінскі вайну сустрэў дзесяцігадовым хлапчуком. Дзіцячая памяць захавала ўсе яе трагічныя малюнкі да самых драбніц. Яны засталіся ў сэрцы паэта на ўсё жыццё.

**4.2. Выразнае чытанне верша настаўнікам**

**4.3. Аналіз першаснага ўспрымання**

- Якія пачуцці ўзніклі ў вас пры слуханні верша? Чым ён вас уразіў?
- А якія словы выкарысталі б вы для характарыстыкі гучання верша?

*( Магчымыя варыянты адказаў:* ***пакутлівае, трагічнае, тужлівае, цяжкое, шчымлівае.*** *Словы-характарыстыкі размяшчаюцца на адной палове дошкі, на супрацьлеглай – малюнкі дзяцей сучаснай Беларусі.)*

- Верш напісаны ў жанры **рэквіема.** Давайце дадзім азначэнне гэтаму жанру. *(У тлумачальным слоўніку азначэнне рэквіема такое: урачыста-жалобны літаратурны або музычны твор, прысвечаны памяці загінуўшых.)*

**4.4. Зварот да міжпрадметных сувязей**

- Пазнаёмімся з узорам рэквіема ў музыцы: гучыць урывак з вакальна-сімфанічнай паэмы беларускага кампазітара Генрыха Вагнера “Вечна жывыя”, які так і называецца “Рэквіем”.
- Параўнайце ўражанне ад музычнага твора і паэтычнага тэксту: якое гучанне яны маюць? *(Адказы вучняў, калі некаторыя вучні будуць адзначаць разыходжанні ў гучанні верша і музыкі, можна даць дадатковае дамашняе заданне: прачытаць твор пад музыку Вагнера, а потым параўнаць іх гучанне.)*

**4.5. Праца над аналізам верша**

- Прачытайце назву верша і эпіграф да яго, вызначце, чыёй памяці прысвяціў А.Вярцінскі свой твор.
- Пералічыце падзеі, факты, звесткі, пададзеныя ў вершы.
- Вылучыце тое, што выклікала ў вас адмоўныя пачуцці і эмоцыі.

- У чым значэнне верша? Чаму вучыць верш?

*(Гэты верш – помнік загінуўшым, ён вучыць нас адвазе, шчырай адданасці Радзіме, змаганню за мір і справядлівасці на ўсёй планеце. Ён прымушае нас памятаць аб трагічных уроках гісторыі.)*

- Я згодна з вамі, нам трэба помніць аб трагічных уроках гісторыі, каб не паўтараць страшных памылак, каб пабудаваць міралюбівае і адкрытае грамадства.

**5. Хвілінка-адпачынку: дамашняе заданне “Вялікая Айчынная вайна ў гісторыі маёй сям’і”**

- Устаньце, калі ласка, тыя, у каго продкі змагаліся з ворагам ці перажылі жудасны час саракавых.

*(Амаль усе дзеці ўстаюць. Настаўнік просіць устаць усіх, таму што вайна кранула кожную сям’ю.)*

- Давайце паслухаем, як закранула вайна вашы сем’і. *(Адказваюць 3-4 вучні)*

**6. Разрыў (зварот да відэа)**

- Праслухаўшы паведамленні, адкажыце на пытанне: на вашу думку, што самае галоўнае ў жыцці? *(Дзеці могуць даць розныя адказы: бацькі, дзеці, мір.)*

- Вялікая Айчынная вайна закранула і маю сям’ю. Пра саракавыя мне расказвала бабуля, зараз яна расказвае пра іх маім дзецям. Мая дачка правяла цэлую даследчую работу. Паглядзіце , калі ласка, невялікае відэа, можа быць, яно дапаможа вам адказаць на пастаўленае пытанне.

*( Настаўнік павінен падвесці дзяцей да такога выніку, што самае галоўнае ў жыцці – само жыццё. А яшчэ – чалавечая памяць, мы павінны памятаць, кім заваёвана наша Перамога, наша жыццё, наша будучыня.)*

7. **Стратэгічнае апытванне** (праца ў групах)

- Памяць, смутак, пакаянне – пачуцці, увасобленыя ў вершы.

Людзі забываюць аб уроках гісторыі, і ў мірны час адбываюцца трагедыі. Канфлікты, адсутнасць бяспекі, слабасць інстытутаў улады і абмежаванасць доступу да правасуддзя застаюцца сур'ёзнай пагрозай для развіцця грамадства. Колькасць людзей, якія ратуюцца ўцёкамі ад вайны, канфліктаў, перавысіла 70 мільёнаў у 2018 годзе, што з'яўляецца самым высокім узроўнем, калі-небудзь зафіксаваным. Ад чаго бягуць людзі? *(Ад вайны) Клас дзеліцца на пяць груп, вучні працуюць над пытаннямі)*

1. Вызначэнне праблемы:

Агульная, канкрэтная.

2. Назіранні:
    - Што вы ведаеце аб гэтай праблеме?
    - Якім чынам вы даведаліся аб ёй?
    - Наколькі іншыя людзі занепакоены праблемай?
3. Пачуцці:
    - Што вы адчуваеце, калі думаеце ці гаворыце пра гэтую праблему?
4. Разважанне:
    - Як бы вы змянілі сітуацыю, калі б захацелі гэта зрабіць?
5. Неабходныя змены:
    - Што неабходна зрабіць, па вашым меркаванні, каб змяніць сітуацыю?
6. Асабістая ацэнка:
    - Што карыснага вы жадаеце зрабіць, каб ажыццявіць гэтыя змены?
7. Вашы ўчынкі:
    - Што б вы зрабілі для вырашэння гэтай праблемы?
    - Якім чынам вы далучыце іншых людзей да вырашэння праблемы?

*(Агучванне вынікаў работ)*

- Як вы думаеце, чаму мы звярнуліся да сітуацыі з бежанцамі?

*(Таму што – гэта наша сучаснасць, гэта таксама – боль, пакуты, слёзы, адчай людзей, якія вымушаны пакінуць сваю Радзіму, таму што пачалася вайна. Асноўная мэта стратэгічнага апытвання на данным этапе ўрока, каб дзеці не забывалі аб жахлівых уроках гісторыі, каб кожны з нас адказваў за свае ўчынкі. Будучыня пачынаецца сёння, і якой яна будзе залежыць ад кожнага з нас.)*

**8. Зварот да другога эпіграфа**

- Прачытайце, калі ласка, другі эпіграф да нашага урока. Як вы разумееце гэтыя словы? *( Усё залежыць ад нас, галоўнае ўсім сэрцам і душой імкнуцца да сваёй мэты. А калі твая мэта – дапамагчы людзям, усяму жывому, то абавязкова знойдуцца аднадумцы,і ты будзешісці да свайго пункта не адзін.)*

**9. Аналіз верша**

- Мы пазнаёміліся з вершам А. Вярцінскага, зразумелі яго сэнс, настрой.
- Прачытайце верш самастойна. Якія асбалівасці вы заўважылі? *(Мы заўважылі, што кожная частка мае вядучы матыў, які ўзмацняецца трагічнымі звесткамі.)*
- Якія словы паўтараюцца ва ўступе? Дзе яны знаходзяцца? Растлу-

мачце іх ролю ў тэксце. ( *Паўтараюцца словы“Вы бачылі лес, дзе прагал скразны?”, яны знаходзяцца ў пачатку радка. Паўтор слоў у пачатку радка павышае эмацыянальнасць верша, узвышае яго тон. Пытанне “Вы бачылі лес?...” звяртае ўвагу чытача на ўзнятую тэму. Такое пытанне не патрабуе адказу і называецца рытарычнае.* )

- Якія словы паўтараюцца ў 1 частцы? Дзе яны знаходзяцца? Растлумачце іх ролю ў тэксце. ( *У канцы страфы паўтараецца словазлучэнне “кожны чацвёрты”. Аўтар гэтым паўторам падкрэслівае значнасць страт, кожны чацвёрты беларус загінуў у гады вайны.)*
- А ці кожны чацвёрты загінуў на вайне? Падцвердзіце свой адказ радкамі з твора. *(А. Вярцінскі ўлічвае і тых, хто памёр ад ран, прапаў без вестак, падарваўся на міне…)*
- Знайдзіце ў тэксце амонімы. Што гэта за словы. Для чаго пісьменнік іх ужывае? *(Амонімы – гэта словы аднолькавыя па напісанні і гучанні, але маюць рознае лексічнае значэнне. Амонімы “...лячылі раны” і “...рана паміралі”. Пісьменнік ужывае іх дзеля таго, каб узмацніць значэнне слова “раны”.)*
- Знайдзіце радкі, у якіх аўтар падкрэслівае, што беларусы змагаліся з ворагам не толькі на фронце. *(Аўтар падкрэслівае, што радную зямлю абаранялі і старыя (Дзед Талаш), і малыя (паянер-герой Марат Казей).*
- У эпілогу паэт звяртаецца да прыёму “спражэння”:

Я іду,
ты ідзеш,
а ён не ідзе…

- Як вы разумееце гэты прыём? З якой мэтай пісьменнік яго выкарыстоўвае?

*(Аўтар супрацьпастаўляе: мы жывыя – яны загінулі, хаця маглі ісці, спяваць, жыц.ь)*

- А зараз параўнайце ўступ і эпілог верша (пачатак і канец верша).

*( Ва ўступе Вярцінскі падрыхтоўвае нас да ўспрымання трагічных падзей, гаворыць пра страты. У эпілогу ўслаўляецца жыццё.)*

**10. Падагульненне**

- Я згодна з вамі. Эпілог уражвае сваёй пераканальнасцю, супрацьпастаўленнем жыцця і смерці. Калі глыбока ўчытацца ў гэтыя радкі, то пачынаеш разумець, якія мы шчаслівыя. Вайна – гэта жах, катастрофа, праз спражэнне дзеясловаў надзвычай выяўна гэта падкрэсліваецца: мёртвыя – жывыя. *(Тут настаўнік звяртаецца да слоў, карткі-асацыяцыі і малюнкаў*

*дзяцей на дошцы:* ***сумнае, балючае, журботнае, жаласлівае, урачыста-жалобнае*** *- гэта "мёртвыя", малюнкі – гэта "жывыя". Так дзеці ўбачаць супрацьпастаўленне наглядна, а не толькі на словах.)*

- А зараз давайце яшчэ раз звернемся да першага эпіграфа нашага ўрока. Да чаго заклікае нас паэт? *(Паэт заклікае нас, каб мы памяталі тых, кім заваявана наша Перамога, аб тых жахлівых падзеях, каб яны больш не паўтарыліся ніколі.)*

**11. Каменціраванае выстаўленне адзнак**

**12. Рэфлексія**

Вучням прапануецца скласці дыяманту (ключавое слова ***вайна***)

Вайна
Жудасная, крывавая.
Забівае, разбурае, знішчае.
Гора, жах, кроў, крыкі.
Нараджае, будуе, павялічвае.
Прыгожы, сонечны
Мір.

13. **Дамашняе заданне:**

1. Напісаць невялікае сачыненне-разважанне на аснове дыяманты.
2. Прачытаць твор А. Вярцінскага пад музыку Вагнера, а потым параўнаць іх гучанне.

**Дадатак 1**

**Асацыятыўная картка**



**Дадатак 2**

**Стратэгічнае апытванне**

Прыклад работы 1 групы

1. Вызначэнне праблемы:

Агульная: "Мы ўстрывожаны глабальнай праблемай узброеных канфліктаў".
Канкрэтная: " Мы ўстрывожаны тымі падзеямі, якія зараз адбываюцца на мяжы з Беларуссю."

2. Пачуцці:

Калі мы назіраем за гэтымі падзеямі, то з аднаго боку адчуваем гонар за сваіх землякоў, якія не прагналі няшчасных людзей, а дапамагаюць ім. А з другога – абурэнне, таму што многім напляваць на праблемы бежанцаў.

3. Разважанне:

Мы пастаремся зрабіць усё, што ў нашых сілах, каб дапамагчы дарослым вырашыць гэтую праблему. Успомніце прыказку: вуснамі немаўляці глаголіць ісціна.

4. Неабходныя змены:

Трэба каб людзі ўсяго свету змянілі свае адносіны да іншых людзей, да ўсяго жывога..

5. Асабістая ацэнка:

Таму мы жадаем уцягнуть грамадскасць у вырашэнне гэтай праблемы.

6. Вашы ўчынкі:

Што для гэтага мы зробім? Створым розныя відэаролікі з заклікам: “Знішчыць усю зброю!”, “Уявіце сябе на месцы бежанца!” Мы па прыкладзе вучня сёмага класа Трэвара МакКіні (герой з кінафільма “Заплаці іншаму”) будзем старацца зрабіць свет больш добрым. Для гэтага трэба аказаць каму-небудзь істотную паслугу і прасіць гэтага чалавека аддзячыць не Вас, а трох іншых людзей, якія, у сваю чаргу, аддзячаць яшчэ траіх, і гэтак далей, распаўсюджваючы цеплыню і дабрыню ў сусветным маштабе. Дык нездарма адзін з эпіграфаў нашага ўрока: “У сэрцы чалавека закладзена сіла, якая дапамагае атрымаць жаданае. Яна не дасць спакою, пакуль ты не дойдзеш да таго самага пункта, да якога імкнуўся. Усё магчыма пры адной умове: па сапраўднаму хацець таго, да чаго ідзеш.”